# «Хай радасць з вачэй нашых бліснe...»

*Хай радасць*
*з вачэй нашых бліснe*
*І ўвенчыцца*
*лаўрамі голаў!*
*Далонь даланю*
*моцна сціснe.*
*Зноў разам мы!*
*Тут наша кола.*
**А. Міцкевіч**


А. Жбанаў

**27** красавіка споўнілася 78 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага гісторыка, культуролага, доктара філасофскіх навук, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Уладзіміра Конана, які летась пайшоў з жыцця. З нагоды дня нараджэння ў Навагрудку адбылася цікавая імпрэза, дзе выконваліся песні філаматаў і філарэтаў, якія так любіў Уладзімір Міхайлавіч.

Таварыствы філаматаў і філарэтаў узніклі ў пачатку XIX стагоддзя і ставілі першапачаткова культурна-асветніцкія мэты. Таксама яны імкнуліся да скасавання прыгону, звяржэння самадзяржаўя, аднаўлення Рэчы Паспалітай, прапагандавалі ідэі роўнасці людзей. Сярод вядомых прыхільнікаў таварыстваў можна назваць Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Тамаша Зана і іншых. Творчасць філаматаў і філарэтаў выклікае вялікую цікавасць і сёння.

Мінскімі аматарамі мастацтва быў здзейснены праект «“Хай радасць з вачэй нашых бліснe...”. Песні філаматаў і філарэтаў», музычным кіраўніком якога выступіла Алена Прохарава. Як адзначыў выканаўца песень, вядомы беларускі бард і паэт Аляксей Жбанаў, «праект мае на мэце наблізіць выбітныя імёны філамацкага кола да сучаснага гледача і слухача, абудзіць цікавасць моладзі да жыцця і творчасці сваіх аднагодкаў, аддзеленых двухсотгадовай часавай дыстанцыяй, і па вялікім рахунку – скасаваць гэтую дыстанцыю, зрабіць памкненні, думкі і пачуцці беларускай духоўнай эліты пачатку XIX стагоддзя складовай часткай сучаснага інтэлектуальнага і культурнага дыскурсу Беларусі». І сапраўды, тыя, каму пашчасціла пабываць на мерапрыемстве, пачулі, як гучалі студэнцкія песні 200 гадоў таму. Асабліва гэта цікава моладзі, тым больш студэнтам. Неабходна адзначыць, што праект адкрыты для ўсіх ахвочых, таму далучыцца і атрымаць вялікае задавальненне ад спеваў можа кожны.

**У** аснову праекта пакладзеныя песні з рукапіснага зборніка, складзенага жонкай Тамаша Зана Брыгітай Свентаржэцкай. Гэты зборнік быў знойдзены музаказнаўцам Святленай Немагай у Віленскім архіве. На беларускую мову песні былі перакладзеныя К. Цвіркам, В. Сёмухам, А. Жбанавым.

Невыпадкова, што імпрэза адбылася ў Доме-музеі Адама Міцкевіча, аднаго з выдатных прадстаўнікоў Таварыства філаматаў.

На мерапрыемства былі запрошаныя знакамітыя беларускія навукоўцы: доктар філасофскіх навук, прафесар Энгельс Дарашэвіч і доктар філалагічных навук, прафесар Аляксей Рагуля.

А. Рагуля адзначыў: «Навагрудчына спараджае геніяў, адзін з іх Уладзімір Конан. У яго было непрыкметнае жыццё; яго творчасць – рэабілітацыя гісторыі беларускага народа. Ён адзін з тых, хто стварыў шлях беларускай народнай культуры».

*Павел САПОЦЬКА,*
*адказны сакратар*
*Дабрачыннага фонду*
*«Спадчына М.К. Агінскага»*
*Фота аўтара*


А. Рагуля

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ